Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 14. Варыянт 5**

**Білет 14. Практычнае заданне. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.**

**Заданні склала:**Кабанава Таццяна Іванаўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА "Нясвіжская гімназія"

***Крыніца 1***

***Вызначце гістарычны тэрмін, пра які ідзе гаворка ў запісцы П.К.Панамарэнкі І.В.Сталіну. 19 ліпеня 1941 г.***

***Пацвердзіце свой адказ прыкладамі з тэксту***

*«Таварышу Сталіну І.В.*

*На занятай тэрыторыі Беларусі немцы пачынаюць арганізавана рабаваць хлеб, жывёлу і г.д. Гас забіраюць ці ледзь не з лямпаў. Усё шырэй становяцца зверскія расправы з насельніцтвам. У Слуцку і некаторых іншых месцах ужо арганізаваны канцэнтрацыйныя лагеры. За дрот заганяюць усіх працаздольных, кормяць поліўкай з каніны 1 раз у 2 дні, рыхтуюць для ўборкі ўраджаю, дарожных і іншых прац. За найменшую праяву незадаволенасці ці адмову ад выдачы камуністаў ці партызан, не кажучы ўжо пра выступы сялян супраць немцаў, вёскі спальваюцца дашчэнту.*

*Па лініі Брэста ўжо працуюць філіялы гестапа, рыхтуюць спісы для шырокіх арыштаў. Астатнія сем'і актывістаў і работнікаў расстрэльваюць проста на вуліцах…»*

***2.Ахарактарызуйце з апорай на фотаздымкі палітыку халакоста акупацыйных уладаў на тэрыторыі Беларусі.***






***3. Разгледзьце карту і фотаздымак. Ахарактарызуйце сутнасць "новага***

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

***парадку", устаноўленага акупантамі на тэрыторыі Беларусі. Як называўся план, у якім адлюстраваліся падзеі, адлюстраваныя на фотаздымках, карце і ў запісцы П.К.Панамарэнкі І.В.Сталіну.19 ліпеня 1941 г.***

Карта спаленых вёсак Беларусі Мэмарыяльны комплекс «АЛА»







Прыклад адказу

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

1. Гаворка ідзе пра палітыку генацыду. Генацыд - гэта форма масавага гвалту, ААН вызначае як дзеянні, якія здзяйсняюцца з намерам знішчыць, поўнасцю або часткова, якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую або рэлігійную групу як такую.

У запісцы П.К.Панамарэнкі І.В.Сталіну ад 19 ліпеня 1941 г. прыводзяцца прыклады рабавання мясцовага насельніцтва, арганізацыя канцлагераў, растрэл мірнага насельніцтва. Спальванні вёсак разам з жыхарамі.

2. Халакост - пераслед і масавае знішчэннеяўрэяў, якія жылі ў Германіі, на тэрыторыі яе саюзнікаў і на акупаваных імі тэрыторыях у часДругой сусветнай вайны. Гэты тэрмін выкарыстоўваецца для абазначэння адной з найбуйнейшых трагедый у гісторыі сусветнай цывілізацыі - знішчэнне яўрэяў у гады Другой сусветнай вайны ў канцлагерах і іншых "фабрыках смерці".

   Мэмарыял «Яма»размешчаны на вуліцы Мельнікайтэ ўМінскуі прысвечаны ахвярамХалакосту. Тут2 сакавіка1942 гадынацыстамі было расстраляна каля 5000 вязняўМінскага гета.

   У перыядДругой сусветнай вайнысловам "гета" сталі называць жыллёвыя зоныакупаваныхтэрыторый Трэцім Рэйхам, якія былі створаны ў мэтах знішчэння яўрэйскага насельніцтва. Гэтая ізаляцыя была часткай палітыкі так званагаканчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Амаль усе вязні габрэйскіх гета былі знішчаны падчасХалакосту. Адным з месцаў масавага знішчэння лічылася Мінскае гета.

3. Генеральныплан «Ост»– нацысцкі план каланізацыі і германізацыі акупаваных падчас Другой сусветнай вайны земляў Усходняй Еўропы, у тым ліку захопленыя тэрыторыі СССР. Гэты план быў заснаваны на "расавай дактрыне" і "тэорыі жыццёвай прасторы" праект ліквідацыі СССР як дзяржавы.

По плане «Ост» меркавалася пакінуць у Беларусі толькі 25% карэннага насельніцтва для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы, астатнія 75% падлягалі знішчэнню ці высылцы ў Нямеччыну.

Дадзеная карта спаленых вёсак пацвярджае выкананне дырэктыў плана "Ост" аб знішчэнні мірнага насельніцтва.

Прыкладам з'яўляецца вёска Ола. 4 студзеня 1944 года вёску атачыў карны атрад і ўсіх жыхароў Олы, а таксама жыхароў іншых вёсак, якія там хаваліся, заганялі ў хаты, якія затым падпальвалі. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі. 1758 чалавек былі забітыя тады, з іх 508 жанчын і 950 дзяцей. Гэтыя факты і лічбы жахлівыя.

Вёска Ола пасля вайны так і не аднавілася. У 2020-м годзе быў адкрыты мемарыяльны комплекс "Ала".

Разглядаючы вышэйпрыведзеныя матэрыялы можна сцвярджаць, што падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусь усталяваны "новы парадак" выяўляўся ў:

- масавым забойстве мірнага насельніцтва;

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

- стварэнне месцаў прымусовага ўтрымання людзей з прымяненнем катаванняў і стварэння нечалавечых умоў знаходжання (гета, канлагера, турмы);
- гвалтоўны вываз грамадзянскага насельніцтва БССР за межы краіны, у прыватнасці на тэрыторыю Германіі для прымусовай працы;
- знішчэнні населеных пунктаў разам з жыхарамі;
- выкарыстанні дзяцей у якасці донараў крыві.

Ажыццяўленне плана «Ост» з'яўляецца сведчаннем палітыкі генацыду - знішчэння насельніцтва па расавых і нацыянальных прыкметах, якую праводзілі нямецка-фашысцкія захопнікі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.